Дашкевіч, А.Л. Палітычныя правы чалавека і маладзёжны рух на Беларусі ў 30-50-я гг. XIX ст. / А. Л. Дашкевіч // Працы гістарычнага факультэта БДУ: навук. зб. Вып. 2 / рэдкал. У. К. Коршук (адк. рэд.) [і інш.] – Мн: БДУ, 2007. – С. 114–117

*А. Л. ДАШКЕВІЧ*

# ПАЛІТЫЧНЫЯ ПРАВЫ ЧАЛАВЕКА І МАЛАДЗЁЖНЫ РУХ НА БЕЛАРУСІ Ў 30—50-я гг. XIX ст.

Погляды на правы чалавека як неад’емны атрыбут універсальнага характару і своеасаблівую ўмову рэалізацыі творчага патэнцыялу асобы, што скlaліся на сённяшні час, прайшлі складаны і супярэчлівы працэс свайго станаўлення і развіцця. Гэта было звязана з ідэалогіяй і практыкай лібералізму,



афармленне якога ў якасці самастойнага кірунку адбылося ў 30—40-я гг. XIX ст. [1]

Сярод розных катэгорый правоў чалавека асобае месца займаюць палітычныя правы, якія вызначаюць магчымасці індывіда на ўдзел у палітычным жыцці і здзяйсненне дзяржаўнай улады. Яны з’яўляюцца абавязковай умовай функцыяніравання іншых правоў і складаюць неабходную аснову сістэмы дэмакратыі, выступаючы сродкам кантролю над уладай. Чым больш абмяжоўваюцца гэтыя правы, тым больш свабоднай у сваіх дзеяннях становіцца ўлада і тым часцей выкарыстоўвае яна гвалтоўныя метады кіравання [2].

На Беларусі пасля далучэння яе да Расійскай імперыі ўсталявалася палітычная сістэма, у якой усе слаі насельніцтва былі пазбаўлены палітычных правоў [3]. Гэта тычылася і шляхты, што супярэчыла сфарміраванаму ў папярэдні гістарычны перыяд уяўленню аб яе ролі ў палітычным жыцці. Такая сітуацыя стала адной з прычын узнікнення на Беларусі з канца XVIII ст. нелегальных антыўрадавых аб’яднанняў, якія ў той ці іншай форме ўздымалі пытанне пра палітычныя правы ў межах сваіх ідэалогій.

Не былі выключэннем і маладзёжныя канспіратыўныя арганізацыі 30—50-х гг. XIX ст., найбольш значнымі з якіх з’яўляліся «Дэмакратычнае таварыства» (1836—1838) і «Братні саюз літоўскай моладзі» (1846—1849).

«Дэмакратычнае таварыства», заснаванае студэнтамі Віленскай медыка-хірургічнай акадэміі, выступала за такія грамадскія адносіны, якія б адпавядалі «натуральнай прыродзе» асобы, за «сцвярджэнне годнасці чалавека супраць знешняга прымусу і самавольства»[4]. У пытанні надання палітычных правоў прызнавалася роўнасць прадстаўнікоў усіх слаёў грамадства, зыходзячы з таго, што гэта з’яўляецца натуральным правам. Удзельнікі таварыства лічылі адным з асноўных палітычных правоў менавіта права на ўдзел у кіраванні дзяржавай. Так, кіраўнік маладзёжнай арганізацыі Франц Савіч зазначаў, што «ўсе людзі маюць аднолькавыя правы ў адносінах свабоды і роўнасці. Паколькі цяпер адны людзі прыгнятаюцца другімі, то гэта не зусім натуральна, і таму трэба ўнушаць усім тое перакананне, што кожны павінен карыстацца аднолькавымі правамі, што кожны мае права кіраваць і таму павінна быць рэспубліка, і людзі павінны кіравацца адным натуральным правам»[5].

У адносінах да выбарчага права і ўдзелу тых ці іншых слаёў у кіраванні дзяржавай у межах аб’яднання існавалі два пункты гледжання. Прадстаўнікі першай пазіцыі лічылі неабходным сканцэнтраваць кіраванне дзяржавай у руках простага народа «як першага дабрадзея і карміцеля». Згодна з другім меркаваннем, якое грунтавалася на прынцыпе роўнага выбарчага права, у будучы прадстаўнічы орган павінны былі ўвайсці асобы, дэлегаваныя ад



усіх саслоўяў. Пры гэтым вылучалася патрабаванне правесці неабходную асветніцкую работу ў асяроддзі простага народа, перад тым як дапусціць яго да ўлады, бо «даць кіраванне ў рукі простаму, неадукаванаму чалавеку, у якім не чалавечыя, а больш самалюбівыя, звярыныя капрызы і жаданні развіты… зразумела, гэта тое самае, што даць у рукі дзіцяці брытву»[6].

Азначаныя погляды грунтаваліся на разуменні ўдзельнікамі таварыства заганнасці існуючай у Расійскай імперыі палітычнай сістэмы. Даволі выразна гэта прасочваецца ў адной з улётак маладзёжнага аб’яднання пад назваю «Заўвагі аб маральнай вайне народа с дэспатызмам», дзе адзначалася, што асноўнай зброяй дэспатызму з’яўляюцца ўладныя ўстановы, дзейнасць якіх накіравана на ператварэнне людзей у рабоў [7].

Пашырэнне ўяўленняў удзельнікаў таварыства ў адносінах да палітычных правоў адбываецца ў сувязі з яго ўваходжаннем у склад «Садружнасці польскага народа» (1835—1838) [8]. У статуце гэтага аб’яднання дэкларавалася неабходнасць увядзення поўнай свабоды друку, права на ўтварэнне і дзейнасць грамадскіх

арганізацый, усеагульнага, роўнага і прамога выбарчага права, а таксама элементаў непасрэднай дэмакратыі [9].

У межах «Братняга саюза літоўскай моладзі», заснаванага ў Вільні братамі Францішкам і Аляксандрам Далеўскімі, праблема палітычных правоў таксама атрымала сваё адлюстраванне. Таварыства выступала за грамадзянскую роўнасць, увядзенне выбарных пасад і парламента, прадастаўленне права на стварэнне палітычных аб'яднанняў і ўдзел у іх працы. Так, блізкі да кіраўніцтва маладзёжнай арганізацыі Цэзар Макжэцкі падчас следства паказаў, што адзін з яго лідэраў Антон Янкоўскі распавядаў яму пра тое, што «калі распачнём паўстанне ў Вільні, то народ пойдзе за намі. Зробім так, як за мяжою, дзе мелі сваіх абраных кіраўнікоў, свой урад. …Пасля створым клубы, у якіх кожны жадаючы змог бы прыняць удзел, народ стаў бы заможны і вольны. …Кожны з нас зможа рабіць свой уклад на пасяджэннях Генеральнай асамблеі. Не памятаю ўсяго, што ён гаварыў. Намерам нашым было ўзняць паўстанне па прыкладу Францыі і зацвердзіць рэспубліканскае кіраўніцтва»[10].

Падсумоўваючы, зазначым, што маладзёжныя нелегальныя арганізацыі на Беларусі ў 30—50-я гг. XIX ст. надавалі даволі значную ўвагу распрацоўцы праблемы палітычных правоў чалавека ў сваёй ідэалогіі. Іх рэалізацыю яны ў першую чаргу звязвалі з усталяваннем у краі рэспубліканскай формы кіравання.

---

1 *Тадевосян Э. В.* Словарь-справочник по социологии и политологии. М., 1996. С. 121.



2 Общая теория прав человека. М., 1996. С. 44.

3 Нарысы гісторыі Беларусі: У 2 ч. Мн., 1994. Ч. 1. С. 280.

4 *Мохнач Н. Н.* От Просвещения к революционному демократизму. Мн., 1976. С. 67.

5 Цыт. па кн.: *Смірноў А. П.* Франц Савіч. Мн., 1962. С. 35—36.

6 Цыт. па кн.: *Мохнач Н. Н.* Идейная борьба в Белоруссии в 30—40-я годы XIX в. Мн., 1971.

7 Цыт. па кн.: *Смірноў А. П.* Франц Савіч. Мн., 1962. С. 42—50.

8 *Смирнов А. Ф.* Революционные кружки и организации в Белоруссии и Литве в 30-х годах XIX века // Исторические записки. 1961. Т. 69. С. 211.

9 *Lopuszanski B.* Ustawa «Stowarzyszenia Ludu Polskego» z 1835 // Przegląd Historyczny. 1969. Z. 2. S. 353—354.

10 Цыт. па кн.: *Fajnhauz D.* Ruch konspiracyjny na Litwie i Białorusi 1846—1848. Warszawa, 1965. S. 307.